Гэтымі днямі меў я ліст ад Фэлькі. Вельмі рад маёй лістоўцы. Шмат добрых пачуцьцяў выказвае яго прачулы ліст. Жыве ён адзін, без сям'і. Наконт працы нічога ня піша. Засталося яму яшчэ тры гады. Шле ён прывітаньне і табе.

Нешта ні слова ня чуваць ад Язэпа. Ці пісала ты, Анечка, Стасі? Напішы, калі не!

Учора з Антосем былі мы ў тэатры на „Женитьба Фигаро“. Рэч сама харошая, ігралі некаторыя моманты таксама добра. Бракавала адзінства стылю ў ігры і шмат якія драбніцы пастаноўкі псавалі ўражаньне.

12 красавіка тут у кіно будзе йсьці дзіцячы фільм „Палескія рабінзоны“. Вот добра было–б, каб Лора з Ляляю наведаліся сюды ка мне. Паглядзелі цікавую карціну. Пэўна–ж, у Слабадзкім гэта карціна яшчэ ня йшла? Калі будзе зручны выпадак, няхай прыяжджаюць 12 красавіка. Напішэце толькі. Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 104. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*12 красавіка 1935 г.*

Любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Сёньня атрымаў я ліст з Анапы ад Нікалая Паўлавіча. Вітае ён Вас і кажа, што шкадаваць ня будзем, калі паедзем у яго бок. Ён хваліць свой горад параўнальна з іншымі месцамі поўдня. Там вельмі харошы дзіцячы пляж. Добра там купацца дзецям, ня глыбока. Што да пражыцьця, дык там не даражэй, як тут. Цэны на прадукты такія, як і тут. Напішу яму ліст і распытаю наконт кватэры і магчымасьці пэдагогічнай работы для цябе. Калі ў гэтым дачыненьні атрымаю станоўчы адказ, дык мы, бадай, яшчэ пасьпеем на вінаградны сэзон туды. А вінаграду там шмат. Я думаю, Аня, падаць заяву ад цябе туды ў горано. Як ты ўважаеш?

Сёньня атрымаў я меркі на туфлі дзецям. Хадзіў у магазін той, а ён там перастройваецца і аддзяленьне абутку было зачынена. Пасылаю Лоры і Лялі кніжкі. Чаму Вы, Лорачка і Лялячка, ня пішаце нічога тату?

Цалую Вас моцна.

Ваш *Адам*.

## № 105. Ганьне, Элеаноры і Алесі Бабарэкам

*22 красавіка 1935 г.*

Дарагія і любыя Анечка, Лорачка і Лялячка!

Мяне вельмі зьдзівіла твая, Аня, лістоўка, пісаная 21.IV, у якой ты кажаш, што ад 12.IV вы не атрымалі ніводнай лістоўкі ад мяне. Гэтаму віною ня я. Якраз гэтым часам я досыць часта пісаў, прынамсі, праз 2–3 дні. Відаць, нашы лістоўкі некага яшчэ цікавяць, што яны так блудзяць.

А ў іх я пісаў, што буду прасіцца на сьвяты к Вам. Падам заяву 25.IV. Пісаў я таксама, што апошнім часам мы працавалі вечарамі і што за гэта нам аплацілі. Я атрымаў дзьвесьці рублёў. Паведамляў, што для Лялі знайшоў туфлі якраз па мерцы, а на Лорыну ногу няма. Лоры купіў 2 кашулі, такія–ж, я[к] купіла ты тады. Сёньня сабе знайшоў туфлі і купіў, а то я дабіў старыя так, што проста болей ужо й